# Краязнаўчы інфармацыйны рэсурс у бібліятэцы: прынцыпы фарміравання і формы папулярызацыі

***І. І. Жэленгоўская,***
*загадчык аддзела краязнаўства*
*Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага*

Быць і заставацца цэнтрам краязнаўства — адна з асноўных магчымасцяў захавання прэстыжу бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Менавіта замацаванне за сабой функцыі збора, апрацоўкі, захоўвання і прадастаўлення ў карыстанне кантэнта — заклад запатрабаванасці і поспеху.

З першых гадоў сваёй працы Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага распачала фарміраванне рэгіянальнай рэсурснай базы. Ужо ў 1947 г. складалася картатэка краязнаўчых матэрыялаў, распісваліся артыкулы з газет Брэсцкай вобласці, друкаваныя раённыя лісткі.

Сёння краязнаўчыя рэсурсы нашай установы — гэта ўнікальная спадчына Берасцейшчыны. Яна дае бібліяграфічную і фактаграфічную інфармацыі, уключае фонд краязнаўчых і мясцовых дакументаў, даведачна-бібліяграфічны фонд, краязнаўчыя бібліяграфічныя паказальнікі, картатэкі краязнаўчых і мясцовых дакументаў і інш. І, безумоўна, падмуркам усяго гэтага з'яўляюцца бібліятэчныя кніжныя фонды, гэта — аснова нашай працы.

Фонд аддзела краязнаўства Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага актыўна папаўняецца. На цяперашні час ён налічвае каля 46 000. адзінак на беларускай, рускай, польскай, украінскай мовах; каля 40 папак малых форм друкаваных выданняў Брэсцкай вобласці (буклетаў, афіш, плакатаў, паштовак і інш.). У складзе фонду аддзела — дакументы на папяровых носьбітах, электронныя, аудыя- і відэаматэрыялы. Сярод іх значная колькасць у выглядзе рукапісных матэрыялаў, ксеракопій, газетных выразак. Тыпалагічную структуру краязнаўчага фонду складаюць навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя, вучэбныя, бібліяграфічныя, мастацкія і іншыя выданні краязнаўчага напрамку.

Багаты ён і сваёй тэматычнай разнастайнасцю, значная доля якой адводзіцца гісторыі і культуры Берасцейшчыны і, ў прыватнасці, самога Берасця (ад першых летапісных узгадак да сучасных грунтоўных даследванняў). Гэта працы як агульнага характару, так і прысвечаныя розным культурна-гістарычным перыядам ці падзеям.

Значнымі і каштоўнымі для нас з'яўляюцца творы і даследванні мясцовых літаратараў, пісьменнікаў і краязнаўцаў. Літаратурна-мастацкі альманах «Брэст» 1958 г. в., гісторыка-краязнаўчыя і літаратурныя зборнікі

«Берасцейскія карані», праца Веры Якаўлеўны Ляшук і Галіны Мікалаеўны Снітко «Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы» і «Літаратурная карта Берасцейшчыны» — тыя кнігі, якія маюць асаблівую цікавасць і каштоўнасць для вывучэння рэгіянальнай гісторыі і літаратурных працэсаў краю.

Папулярнасцю ў нашых чытачоў карыстаецца біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі «Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі», выдадзены ў 2018 г., да якога, дарэчы, супрацоўнікамі аддзела краязнаўства былі зроблены шматлікія ўдакладняючыя звесткі па просьбе яго складальніка — Надзеі Мікалаеўны Парчук. Гэта адзін з прыкладаў прафесійнай дзейнасці бібліятэкі па папулярызацыі ведаў аб сучасным стане берасцейскай літаратуры.

Штогод фонд аддзела папаўняецца новымі выданнямі. У бібліятэку трапляюць кантрольныя экзэмпляры ўсёй друкаванай прадукцыі, якая выдаецца на тэрыторыі вобласці. Абавязковы бясплатны асобнік — адна з галоўных крыніц папаўнення. Важнай складаючай краязнаўчага фонду з'яўляюцца дары ад пісьменнікаў, краязнаўцаў, навукоўцаў.

Вычарпальнае камплектаванне краязнаўчымі дакументамі і іх паўната ў бібліятэчным фондзе дасягаецца тыповымі метадамі бібліятэчнай работы: адсочваюцца навінкі выдавецтваў, праглядаюцца тэмпланы, праспекты, прайс-лісты; улічваюцца пажаданні чытачоў, вядзецца праца з адмовамі. Яшчэ адна з крыніц папаўнення — абменны фонд, які фарміруецца з дароў жыхароў горада, арганізацый і фондаў НББ.

Адбываецца і дакамплетаванне фонду рэдкімі і каштоўнымі краязнаўчымі кнігамі мінулых гадоў выдання, пошук інфармацыі аб іх наяўнасці ў розных кніжных калекцыях і зборах.

Вядома, што адным з галоўных рэсурсаў для прыцягнення чытача ў бібліятэку з'яўляецца кніжная выстава. Яна, як форма бібліятэчнай працы, наглядна садзейнічае максімальнаму раскрыццю зместа бібліятэчнага фонду. Прыярытэтным накірункам дзейнасці ў сферы камплектавання дакументнага фонду абласной бібліятэкі з'яўляецца праца з тэмпланамі сацыяльна-значных выданняў, зацверджаных Загадам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сёння экспазіцыі навінак сацыяльна-значнай літаратуры, якая трапляе ў бібліятэчныя фонды, працуюць на пастаяннай аснове і карыстаюцца попытам у некалькіх аддзелах нашай установы — аддзеле краязнаўства, агульнай чытальнай зале, абанеменце, дзіцячым і юнацкім аддзелах.

Якасныя вынікі і плён краязнаўчай працы дасягаецца дзякуючы партнёрству з разнастайнымі навуковымі і культурнымі арганізацыямі, грамадскімі творчымі саюзамі, установамі адукацыі. Супрацоўнікамі

бібліятэкі ладзяцца выязныя мерапрыемствы з падрабязнымі грунтоўнымі аглядамі кніжных выстаў на іншых пляцоўках Брэста і вобласці, такія як Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Следчы камітэт Брэсцкай вобласці, Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр і інш.

На працягу ўсяго існавання Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі абласная бібліятэка плённа супрацоўнічае з ім. У першую чаргу праз папаўненне кніжных фондаў і вычарпальна поўную аналітычную бібліяграфічную апрацоўку ўсіх інфармацыйных матэрыялаў аб творчасці берасцейскіх пісьменнікаў. А таксама праз ўключэнне гэтай інфармацыі ў рэспубліканскія і рэгіянальныя карпаратыўныя электронныя інфармацыйныя рэсурсы. Гэта спецыфіка навукова-даследчай дзейнасці абласной бібліятэкі як рэгіянальнага цэнтру па зборы, апрацоўцы і захоўванні ўсіх матэрыялаў, якія тычацца гісторыі культуры Брэстчыны.

Асноўнымі крыніцамі пошука краязнаўчай інфармацыі з’яўляецца электронная бібліяграфічная база даных «Краязнаўчая літаратура», якая ўваходзіць у склад электроннага каталога. На сённяшні дзень яна налічвае больш за 100 000 бібліяграфічных запісаў і папаўняецца ў бягучым рэжыме. Рэсурс змяшчае апісанні артыкулаў з кніг, газет, часопісаў і штогод папаўняецца супрацоўнікамі бібліятэкі прыблізна на 6000 запісаў. Бібліятэкай апрацоўваюцца каля 150 найменняў краязнаўчай перыёдыкі, распісваюцца зборнікі, прымаецца ўдзел у стварэнні краязнаўчых рэтраспектыўных і бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў «Новая літаратура аб Брэсцкай вобласці … ». З 2019 г. вядзецца плённая праца па стварэнні Рэгіянальнага зводнага электроннага каталога.

Бібліяграфічны аспект — галоўны і найбольш важны ў працы аддзела краязнаўства. Але не менш важным для папулярызацыі краязнаўчых рэсурсаў з’яўляецца і сацыяльна-культурная работа.

Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага з’яўляецца месцам правядзення творчых сустрэч і прэзентацый новых кніг, найперш краязнаўчай тэматыкі.

Падчас адзначэння юбілеяў знакамітых берасцейскіх аўтараў, атрымання імі значных дзяржаўных узнагарод, сацыякультурная дзейнасць у сферы арганізацыі творчых сустрэч у абласной бібліятэцы заўжды мела прыярытэтны характар. За апошнія гады ў сценах установы адбыўся шэраг мерапрыемстваў і з удзелам аўтараў-членаў Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі: Зінаідай Дудзюк, Таццянай Дземідовіч, Аляксандрам Валковічам, Георгіем Тамашэвічам, Анатолем Брытуном, Таццянай Канапацкай, Расціславам Бензеруком і інш.

Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага з’яўляецца нязменным удзельнікам святочных урачыстасцяў з нагоды ўручэння Літаратурнай прэміі Брэсцкага аблвыканкама імя У. А. Калесніка. Да кожнай імпрэзы супрацоўнікі ўстановы рыхтуюць разгорнутыя кніжныя выставы з аглядамі, на якіх экспануюцца кнігі-лаўрэаты ўсіх гадоў, а таксама кнігі-намінанты бягучага года. Сярод іх асаблівай папулярнасцю карыстаюцца выданні з аўтографамі берасцейскіх пісьменнікаў, калекцыя якіх шырока прадстаўлена ў фондзе аддзела краязнаўства. З інфармацыяй аб усіх намінацыях прэміі можна азнаёміцца на сайце бібліятэкі, у раздзеле «Кнігі-лаўрэаты прэмій» — «Літаратурная абласная прэмія імя У. Калесніка 2007–2021 гг.» у выглядзе алічбаваных вокладак, з адзнакамі аддзелаў бібліятэкі, у якіх знаходзяцца кнігі, і анатацыямі да выданняў. Безумоўна самі мастацкія тэксты заўсёды можна пагартаць у чытальных залах нашай установы.

Краязнаўчая праца патрабуе пастаяннага працягу і ўдасканальвання. На сучасны дзень рэгіянальныя інфармацыйныя рэсурсы запатрабаваны і ў папяровай, і ў электроннай форме. Алічбоўка тэкставага дакумента ў электронны выгляд дазваляе зберагчы фонд, стварыць базу тэкстаў. На дадзены момант бібліятэка надае асаблівую ўвагу планамернай алічбоўцы найбольш каштоўных з іх. Важнай складаючай бібліятэчнага краязнаўства з’яўляецца стварэнне інфармацыйнага асяродку, якое можа сарыентаваць свайго карыстальніка ў атрыманні патрэбных яму бібліятэчных рэсурсаў згодна тэме яго запыту.

У мэтах папулярызацыі краязнаўчых ведаў і краязнаўчых рэсурсаў сярод насельніцтва супрацоўнікамі Брэсцкай абласной бібліятэкі распрацоўваюцца электронныя прадукты на падмурку традыцыйных друкаваных дакументаў і матэрыялаў. Апошнім дасягненнем у гэтым накірунку з’яўляецца электронны рэсурс «Уладзімір Калеснік — чалавек Адраджэння», які пабачыў свет напрыканцы мінулага года і быў створаны да 100-годдзя з дня нараджэння вядомага навукоўца-літаратара. Ён складаецца з 7-мі раздзелаў і знаёміць з алічбаванымі тэкстамі кніг і водгукаў на іх, а таксама артыкуламі з перыядычнага друку. Бібліяграфія налічвае больш за 1300 пазіцый. Рэсурс аздоблены фатаздымкамі з фонду абласной бібліятэкі і хатняга архіва пісьменніка.

Акрамя гэтага, абласная бібліятэка сумесна з бібліятэчнымі сістэмамі вобласці вядзе працу па стварэнні агульных карпаратыўных віртуальных праектаў, прысвечаных знакамітым людзям Берасцейшчыны. Ужо створаны карпаратыўныя электронныя рэсурсы краязнаўчага накірунку: «Непрачытаная кніга Васіля Фёдаравіча Праскурава» і «Ян Чачот — прадвеснік беларускага Адраджэння». Цікавым вопытам для бібліятэкі было

стварэнне электроннага рэсурса «Узняцца да лёсу чалавечага: да 75-годдзя з дня нараджэння Валянціны Локун».

Сістэмай калектыўнага фармавання і карыстання публічных бібліятэк рэгіёна з'яўляецца і субдамен асноўнага сайта — «Краязнаўства Берасцейшчыны». У яго склад ўваходзяць наступныя раздзелы: «Навіны», «Навінкі фонду», «Хроніка культурнага жыцця Берасцейшчыны», «Каляндар», «Бібліятэка». Найбольшую цікавасць уяўляюць: паўнатэкставая база даных «Кнігі „Памяць“» Брэсцкай вобласці — алічбаваная серыя гісторыка-дакументальных хронік, выдадзеных ў перыяд з 1987–2003 гг., ЭБД «Брестский мир», створаная на аснове бібліяграфічнага паказальніка «Брестский мир: 95 лет со дня подписания» і ЭБД «Спадчына».

Апошняя складаецца з пашыраных тэматычных даведак з бібліяграфічнымі спісамі літаратуры аб грамадскіх дзеячах, дзеячах мастацтва і культуры. У ёй таксама змяшчаюцца звесткі аб прадпрыемствах, арганізацыях, памятных мясцінах, гістарычных падзеях Берасцейшчыны.

Падводзячы вынікі свайго выступлення хочацца яшчэ раз падкрэсліць, што краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк заўсёды мелі і маюць велізарную гісторыка-культурную каштоўнасць для нашага грамадства і бібліятэка адыгрывае выключную функцыю ў іх фарміраванні і захаванні.